№ 96 Ausgabe B.

ГОМАН

№ 96 (292). Год III. Вільня, 6 сьнежня 1918 г. Цана 10 фэн. (5 кап.)

ТЭЛЕГРАМЫ.

ЛІБАВА. Ангелькі адмірал, каторы прыехаў сюды з 12 мінаносцамі, адмовіўся прыняць нямецкіх начальнікаў.

ЛОНДОН. 4.XII. Бонар Лёў у публічнай прамове заявіў, што англіцкі ўрад дамагаецца выдачы нямецкага імпэратара, каб аддаць яго пад суд.

БЭРЛІН. З Амэрыкі наказуюць іскровай тэлеграмай з 29 лістапада, што саюзьніцкія і амэрыканскія войскі часова займуць Бэрлін, каб спаўняць там чыннасьці паліцыі.

РОТТЭРДАМ. 4.XII. (В.Т.Б.). Льлёйд Джорж на публічным сходзе сказаў, што кара для Нямеччыны будзе страшэнная і цяжэйшая за ўсе даўнейшыя.

СПАА. 2 XII (В.Т.Б.). Фінансов. камісія мірнай конфэрэнцыі падпісала 1 сьнежня ўмову, паводлуг каторай нямецкі ўрад абязываецца не прадаваць і не закладаваць заграніцай або ў прыватных асоб у Нямеччыне казённае меньне. Пры разрахунках між саюзьнікамі і Нямеччынай устаноўлен гэткі курс грошы: 1 марка=1,25 франкаў.

АМСТЭРДАМ. Францускія газэты наказаваюць:

Няшыбкая выдача немцамі жалежнадарожных матэрыялаў адцягівае мірныя перагаворы, бо да выдачы ўсіх жалезнадарожных матэрыялаў, паказаных пры замірэньні, немцаў ня пусьцяць на конфэрэнцыю.

ВАШЫНГТОН. 4.XII. (Рэўтэр). Вільсон у аўторак у вечары выехаў у Эўропу.

ВАШЫНГТОН. 3.XII. (Рэўтэр). Прэзыдэнт Вільсон тлумачыў свой праект падарожы ў Эўропу гэтак:

Перагаворы аб міры пачаліся з яго, Вільсона, ініцыятывы на аснове апрацаваных ім 14 пунктаў. Ясна, што пры устанаўленьні аканчацельнага міра саюзьнікі хочуць карыстацца яго радамі.

Моральныя інтарэсы Амэрыкі вымагаюць. каб пры падпісаньні міра, які быў ею зачаты, амэрыканскія прынцыпы праводзіліся ў жыцьцё і не тлумачыліся ў фальшывым духу.

БЭРЛІН, 4.XII. Людвігсгафэн і Кобленц ачышчаны ад нямецкіх войск і могуць быць аддадзены саюзьніцкім войскам.

ГААГА. 4.XII. Нямецкі насьледнік падпісаў адрачэньне ад насьледзтва імпэратарскай кароны.

БЭРЛІН. 5.XII. Прынц Адальбэрт, трэці сын нямецкага імпэратара, выпусьціў заяву, кажучы ў ей паміж іншым:

„Супроць майго дзядзькі, прынца Гэнрыка, я заяўляю, што прызнаю істнуючый урад і абяцую паддзержываць яго ўсемі сіламі“.

ПРЫМКЭНАУ. 4.XII. Швагра Імпэратара Вільгэльма, прынц Эрнст Гюнтэр, заявіў на публічным сходзе, што сваю зямлю ён гатоў аддаць пад соцыяльную рэформу. Ужо 20 гадоў ён змагаецца за 8-гадзінны рабочы дзень, — праўда, з тым, каб работнікі рабілі за 8 гадзін гэтулькі, скольки раней за 10.

БЭРЛІН. 4.XII (В.Т.Б.). Дэлегаты палкоў гварды прынялі рэзалюцыю аб прызнаньні часовага ўраду Эбэрта-Газэ, які яны будуць паддзержываць проці ўсіх напасьцяў, скуль-бы яны ні выходзілі.

КЕЛЬН. 4.XII. У начы і ў дзень адбываліся цяжкія разрухі і рабункі крамаў і ваенных складаў. У бітвах з паліцыей забіты 4 асобы і многа раненых. Пасажырскі і таварны рух наа бупал Рэйну прыпыніўся.

БЭРЛІН. 4 XII. Спроба расейскіх большевікоў самавольна пасланць сваіх дэлегатаў на нараду нямецкіх салдацкіх рад 16 сьнежня вызвала ў цэнтральнай радзе усходняга фронту станоўчы адпор. Расейскія дэлегаты ні ў якім здарэньні ня будуць прапушчаны цераз усходні фронт.

БЭРЛІН. 4 XII. (**Урадова**). Спаўняючый камітэт. Ня сягоньняшнім засяданьні была прачытана тэлеграма савецкага ўраду аб жаданьні папярэдзіць усялякія стычкі. Спаўняючый камітэт тэлеграмай яшчэ раз прадлажыў расейскім дэлегатам прыняць учасьце ў конфэрэнцыі работнікаў і салдатаў.

ГЭЛЬСІНГФОРС. **Урадова**. Большэвіцкія войскі прабавалі зыйсьці на бераг на ўсходзе ад Выбаргу, але былі адбіты. На фінляндзкай усходняй граніцы зьбіраюцца большэвіцкія войскі. Часьць іх перайшла цераз граніцу, але была адбіта.

У Фінскім заліве знаходзіцца большэвіцкі флот. Між Гэльсінгфорсам і Рыгай зносіны спынены.

ВАРШАВА. 4.XII. У часе бытнасьці тут Корфанта на яго было зроблена пакушэньне нейкім соцыялістам. Апошняга арэштавалі і на жаданьне генэрала Сосноўскага аддалі ў яго рукі.

РОТТЭРДАМ. 3.XII. У новую англіцкую ніжнюю палату ў пачатку 1919 году будзе пададзен праект аб забароне чужынцам сяліцца ў Англіі. Пазваленьне будзе давацца толькі ў паадзінокіх прыпадках, калі эмігрант давядзе, што ён палітычны бежанец ў прызнаным саюзьнікамі значэньні.

ВЕНА. 4.XII. У Карльсбургу ўчора адбыўся вялікі румынскі конгрэс, прыняўшый рэзалюцыю з жаданьнем прылучэньня да Румыніі Сяміградзіі (Трансыльваніі) і Банату.

БАЗЭЛЬ. 4 XII. Энвэр-паша заявіў, што ён едзе на Каўказ працаваць дзеля адбудовы незалежнай Османскай дзяржавы.

КОПЭНГАГА. 3.XII. Данскі кароль падпісаў данска-ісляндзкую ўмову. У сталіцы Ісляндыі Рэйк'явіку абвешчапа незалежнасьць і вывешан ісляндзкі флаг.

І. Сербаў.

Аб беларускай народнай песьні.

(Гл. „Гоман“ № 95).

Купля маладой. Цешча разуваецца і сядае на прыпечку, а зяць купляе ў яе дачку —сваю княгіню, падносячы новыя лапці з аборамі і плацячы некалькі манэт. Малодшы брат, дзержачы даўгую лучынку, прадае сваю сястру-княгіню і расплятае ёй касу. Подружкі пяюць і паяжджанкамі сватом насьмешлівыя песьні:

Ой, сват на парог лезе,
У печку пазірае.
— Ці вялікі гаршчок кашы
Будзе сям'і нашай?
Ажно ў печы проса —
Глядзяць сваты коса.
А другі кажа: маўчы —
Заставяць нас таўчы,
Дровы і ваду насіць,
Ложкі і гаршкі мыць!
Тады трэці спужаўся
Пад лаўку схаваўся! [1])

Але і паяжджанкі не даровываюць:

Паднявесьніцы нашы
К сьцяне прылягаюць,
Клапоў выбіраюць.
Паднявесьніцы — немы,
Грэцкую муку елі.
Грэцкая мука сопка —
Перасела ім глотка.
А ў большай дружкі
Грудзі па кадушцы.
Сама лупавока,
Ходзе крывабока!.. [2])

[1]) Кульшычы.
[2]) Кульшычы.

Маладыя абходзяць родных і разьвітаваюцца з імі, а дружкі ўрачыста пяюць:

Стань, мая мамачка,
У парозе,
Сяньні я ў цябе
У дарозе.
Стань, мая мамачка,
Блізенька —
Укланюсь табе
Нізенька,
Коскамі зямельку
Усьцялю,
Сьлёзкамі ножачкі
Аблю! [3])

* * *

Заграбай, маці, жар,
Заграбай:
Будзе табе дачушкі
Сільна жаль.
Заграбай, мамачка,
Увесь попел:
Мы тваю дачушку
Ухопім! [4])

* * *

Ля варот бяроза
Стаяла,
Ля двара княгіня
Зьяжджала.
Сарвалі з бярозы
Вярхушку.
Стой, мая бяроза,
Бяз верху.
Жыві, мая мамачка,
Бяз мяне,
Бяз русай касы
Бяз мае! [5])

* * *

Шаўкова нітачка
К сьценцы льне —
Княгіня мамачцы
Чалом б'е.
Ой, адбіла...
За стало...
Сказала „дабранач“
За двaром.
— Дабранач, мамка,
Дабранач!
Ня буду к табе
Я на нач.
Ні на 'дну ночку
Ні на дзьве
Не жадай мяне
Ты к сабе.
Што ёсьць дзевачак —
Народу,
То ўсіх з сабою
Павяду! [5])

* * *

Ой, была ночачка,
Ды ўжо сьвет;
Праснулася мамачка —
Дачкі нет.
Туды-сюды мамачка,
Дачкі нет.
Туды-сюды мамачка,
Вочкі трэць,
Вышла за вароцічкі —
Толькі сьлед!..
— Куды гэта травачка
Палажона,
Туды мая дачушка
Павязёна?
— Палажона травачка
У шчыры бор —
Павязёна дачушка
У сьвёкраў двор!

Паяжджанкі, выходзячы з хаты, пяюць крыўдныя песьні:

Ой, былі мы ў Кракове;
Там людзі 'днаковы.
Елі кашу несалёную.

[3]) Кульшычы.
[4]) Кульшычы.

[5]) Кульшычы.

Вільня, 6 сьнежня 1918.

Польская чорная сотня, якая ад часу адходу з нашай зямлі расейскіх войск стараецца заняць места царскіх чыноўнікаў, страшэнна непакоіцца з прычыны таго, што Беларусь і Літва будуюць сваю незалежную дзяржаўнасьць.

У незалежнай Беларусі і Літве будуць гаспадарамі многаміл̈ьённыя масы працоўнага народу, а ня жменя польскіх паноў.

У незалежнай Беларусі і Літве зямля будзе прыналежаць народу, а ня тэй-жа жмені польскіх паноў. А тады і ўся сіла і моц польская тут счэзьне.

У незалежнай Беларусі і Літве будзе поўная свабода для кожнай мовы, для кожнай веры, і скончыцца панаваньне тых, хто ўзьнімаў сваркі між сынамі адной Маткі-Бацькаўшчыны на грунце нацыянальнасьці і веры.

І страх зьнімае ўсіх тых, хто сваё шчасьце і багацьце будаваў на цемнаце, беднасьці і паняволеньні працоўнага народу Беларусі і Літвы.

Каб за ўсялякую цану захаваць здабытыя крыўдай народу „пляцоўкі", гэныя цёмныя сілы працуюць, як мага, каб перашкодзіць нам у будаваньні нашай вольнай і незалежнай дзяржавы.

Па ўсім сьвеце працуюць іх пасланцы, каб заглушыць голас нашых народных мас, дабіваючыхся новага ладу на роднай Зямлі. Брахня, фальшаваньне фактаў, фальшаваньне народнае волі — вось іх улюбленае аружжа.

А побач з гэтым яны не кідаюць сваю працы і ў нашым краю, баламуцячы галовы нашага сялянства рознымі фальшывымі гутаркамі і пісаньнямі.

Перш гаварылі нам аб тым, быццам поўная свабода і незалежнасьць будуць шкодны для нашага народу. Быццам бяз панскай „апекі" ня можа быць шчасьця для нас. — Ды гэту брахню народ ужо распазнаў, — распазнаў, што толькі тады прыйдзе для яго добрая доля, як уся ўласьць стоўпіцца ў народных руках.

Цяпер ворагі нашае волі сьпяваюць на іншы тон. Яны, бач, самі нічога ня маюць проці нашае незалежнасьці. Яны толькі з міласьці да нас папярэджваюць нас, што ні незалежнай Беларусі, ні Літвы, ні Украіны, ні Латвіі ніколі ня будзе, бо гэтага не дапусьцяць „вялікія дзяржавы".

Так піша ў нумэры з 4 сьнежня орган польскіх чорнасоценцаў у Вільні—„Dziennik Wileński". Будзе, піша ён, толькі Польшча і Расея. Дык хто хоча волі, няхай ідзе пад Польшчу.

Няўжож гэта праўда? Няўжож ўвесь сьвет толькі затым прызнаў права кожнага народу па сваёй думцы устроіць сваё жыцьцё, каб з яго карысталі адны толькі палякі?

Сьмяхотная гутарка!

Адно з двох: або вялікі прынцып самаазначаньня народаў, узросшы на руінах зьнішчаных мест і вёсак, аблітых шчодра крывёй чалавечай, запраўды ляжа ў аснову новага жыцьця на зямлі, —або ён ёсьць фальш і мана. Калі гэта — толькі пустыя словы палітыкаў, калі цана ім — грош, дык і незалежнасьць Польшчы — гэта будоўля на пяску. Польскі народ ня мае аружнае сілы, каб адваяваць сабе незалежнасьць ад усяго сьвету; ён не дужэйшы за беларусаў, ці літвіноў, раўнуючы да эўропэйскіх волатаў, якія адным словам будуюць, або ніштачаць цэлыя дзяржавы. І калі вялікія дзяржавы перашкодзяць нам у будаваньні нашай незалежнасьцяй, дык не бязсільнай Польшчы „ратаваць" нас.

Мы жадаем братняму польскаму народу волі, незалежнасьці і поўнага шчасьця. Але прыйдзе яно толькі тады, як польскі народ ачысьціць сваю зямлю ад дармаедаў, каторым мала ссаць кроў з сваіх працоўных мас і якія працягаваюць свае прагавітыя рукі па нашу зямлю. Толькі тады запануе братняя згода між вольнымі і незалежнымі Беларусьсю, Літвой, Польшчай і другімі дзяржавамі, якія будуюцца на руінах разьбітай самадзяржаўнай Расеі.

Аб разьвязцы зямельнага пытаньня.

Тыя вялізарныя перамены, якія ўжо зрабіліся і робяцца далей у жыцьці нашага народу і ўсяго краю, ідуць так глыбока і так далёка, што няма ніякае магчымасьці абмінуць разьвязку таго пытаньня, якое для нашай хлебаробнай Беларусі мае, бадай, найвялікшую вагу.

Гэта — пытаньне зямельнае. І ўжо пара прыступіць да падгатоўкі яго, каб мы не зьявіліся на ўстаноўчы сойм з пустымі рукамі і непрыгатаваныммі.

Над разьвязкай зямельнага пытаньня ў былым Расейскай дзяржаве ужо даўно пачаў працаваць з аднаго боку расейскі ўрад і землеўласьнікі, з другога — тыя партыі, якія крэпка стаяць з народ працоўны. Урадовая разьвязка, за якую горача стаялі і ўсе вялікія паны, выявілася ў так-званым «землеустройстве»: расейскі ўрад пастанавіў, што ядынае лякарства на малаземельле — гэта прадажа сялянам зямлі цераз «Сялянскі Банк». Урад цьвёрда бараніў карысьці паноў і заявіў, што ён ніколі не дапусьціць нарушэньня «сьвяшчэннага» права зямельнае ўласнасьці. Вядома, паном гэта было вельмі да спадобы, тым больш, што той «Сялянскі Банк» быў папраўдзі больш „Панскім", бо плаціў паном надта вялікія грошы за зямлю і яшчэ даражэй збываў яе сялянам.

Калі б народ у нас жыў не ў няволі, не пад ярмом; калі б ён быў добра адукаваны, меў добрыя школы і паддастаткам; калі-б побач з агульным навучаньнем былі заведзены спэцыяльныя ніжэйшыя і сярэднія школы сельскай гаспадаркі; калі б для нашых хлебаробаў быў наладжаны дробны крэдыт і крэдыт дзеля паляпшэньня гаспадаркі; калі-б наагул пры надзяленьні сялян зямлёй у 1861 гаду яны не былі страшэнна пакрыўджаны; калі-б наследкі гэтага не выяўляліся ў форме упадку культуры наагул і зямельнай культуры асобна, ў нястачы грошы на абарот, у малазямельлі і г. п.; адным словам, калі-б спрва разьвязкі зямельнага пытаньня не была ужо вострай, — тады-б казённае «земляустройства» было-б так сама карысна, як і работа прыватных парцэляцыйных таварыств і кантор, Але як «земляустройствам» была падменена ўся зямельная рэформа; як Столыпін загадаў паддзержываць не малаземельных земляробаў, а перш за ўсё вясковых багатыроў; як урэшце ў нашым краю «Сялянскі Банк» кіраваўся ймчэ і да палітычнае мэты: засяленьня Беларусі маскоўцамі, — дык дзіва няма, што ўся казённая праца над разьвязкай зямельнага пытаньня не дала ніякіх рэзультатаў, а сяляне, якія куплялі зямлю праз банк, ня мелі магчымасьці крэпка станаць на ногі і пападалі быццам у прыгонную службу да банку, працуючы адно дзеля сплаты доўгу за зямлю.

Крок далей зрабіла ў гэтым кірунку расейская партыя кадэтаў («народнай свабоды»). Але і іх праект зямельнай рэформы быў збудован на такіх самых асновах, як і Сталыпінскі. Розьніца толькі ў тым, што кадэты праектавалі ў меру патрэбы *прымусовы* выкуп панскай зямлі.

Як бачым, і казённы, і кадэцкі праекты зусім не разьвязвалі зямельнага пытаньня. Яны толькі мелі на мэце ажывіць таргоўлю зямлёй, ні на адну мінуту не дапускаючы думкі, каб маглі пацярпець пры гэтым *інтарэсы паноў*. Апошняе характэрызуе наагул зямельныя праграмы буржуазных партый, каторыя ўсе зьмяшчаюцца паміж памянутымі двума праектамі.

З іншага боку падыходзілі да зямельнай справы соцыялістычныя партыі. Яны на першым месцы ставілі *карысьць сялян*. Само сабой разумееца, што яны, каб падняць сялян супроць старога расейскага ўраду, сулілі зямлю ім дарма. Але і між соцыялістамі ня было згоды ў пглядах на тое, на якіх асновах і як правасьці самы гэты надзел.

Праграмы соцыял - дэмакратаў праводзілі два спосабы. У адных ішла гутарка аб «прырэзцы» зямлі, каб давясьці да старой нормы сялянскія гаспадаркі, раздробленыя ад часу надзелу 1861 году. Гэтыя праграмы ставілі на грунце *захаваньня прыватнай уласнасьці*. З другога боку высоўваўся праект *муніцыпалізацыі* зямлі, — значыць, прызнаньня ўсіх земель грамадзкай уласнасьцяй. Але як адзін, так і другі праект пакідаў *індывідуальную* гаспадарку, значыць, кожын з гаспадароў гаспадарыў, як і да гэтуль, сам адзін, незалежна ні ад каго.

Соцыялісты-рэвалюцыянеры праектавалі разьвязаць справу іначай. Яны прызнавалі за аснову зямель-

---

А капусту неваронную.
Паехалі — насытаўшыся;
Прыехалі згаладаўшыся.
Паехалі — як бочачкі,
Прыехалі — як дошчачкі! [6])

Паяжджанье. Паяжджанкі, што едуць з маладымі, голасна пяюць:

Адчыні, мамачка,
Новы двор, —
Ой, едзе к табе
Сын на двор.
Ой, вязе скрыначку,
Пярыну,
Ды маладую
Княгіню.
Выйдзі, мамачка,
Паглядзі
Ды што мы табе
Прывязьлі:
Адчыні, мамачка,
Скрыначку,
Паглядзі сваю
Мілачку.
Раскаці, мамачка,
Трубачку;
Прывезьлі нявестку —
Любачку.
Запалі, мамачка,
Жыжачку;
Прывезьлі табе
Грычанку!.. [7])

* * *

Ой, лятаў рой
Над гумном,
А нявехначка
Грым на двор.
Ох, ні рою-ж мне
Аграбаць,
Ні нявехначку
У хату звваць.
Ой ты, раёчку,
Падажджы,
Ты, нявехначка,
У хату йдзі!
Сядзі, раёчку,
У ставочку,
Жыві, нявехна,
У дамочку! [8])

Маладая ў хаце сьвякра вешае свой ручнік і засьцілае сталечнік, а паяжджанкі далей пяюць:

Ой, пашоў вінаград
Пазалісьціку.
Сьцелячы лічточкі
Па карэньніку.
Ой, пашла маладая
Па закуцьціку,
Сьцелячы скацеркі
Па застольліку.
Зьнімайце вы свае
Паскарныя —
Засьцялю я свае
Бялявыя! [9])

Пасьля маладой прыяжджаюць яе бліжэйшыя сваячкі-вячарніцы, каторыя, разам з сьвякрывёй і хрышчонай маткаю маладога сьцеляць у клеці пасьцель і вядуць маладых спаць. Вячарніцы дружна пяюць:

Чорная галачка
У сад паляцела,
Маладая Ганначка
Спаць захацела.
Ой, ці ў клець вядзеце
Маладую сьпаць,
А ці тут кладзеце
Яе начаваць!
Пуховую пасьцельку
Мы пасьцелем,
Белую скацерку
Ей засьцелем.
У клець маладую
Мы павядзём,
Спаць на пярыне
Яе пакладзём!

Падняўшы маладых з пасьцелі, вячарніцы завіваюць маладую і жалобна пяюць:

Завіваначка плача,
Завівацца ня хоча.
Наша Ганначка хмельна
Сваю косачку сьцерла.
Ой, сьцерла і зьмяла,
Ды пад чэпчык схавала! [10])

* * *

У панядзелак рана
Нешта сіня мора йграла.
Там наша маладая
Ды вадзічаньку брала.
Ой, вадзіцу чарпала,
Усё на бок пазірала.
— Ці ня едае мой татка,
Ці не вязе выкупа?
Ох, ці я тут прыдадзёна,
Ці замуж аддадзёна?
Калі я запрададзёна,
Няхай мяне выкупляе;
Калі замуж аддадзёна —
Чаму. не праяжджае
Дачкі свае праведаці,
Жыцьця майго паглядзеці! [11])

(Далей будзе).

[6]) Кульшычы.
[7]) Кульшычы.
[8]) Кульшычы.
[9]) Кульшычы.
[10]) Кульшычы.
[11]) Кульшычы.

Грамата Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

Народзе Беларускі і усе народы Беларускай зямлі!

Слухай голасу тваіх прадстаўнікоў, што працуюць тваім імянем і дзеля твайго шчасьця.

Шмат сотняў гадоў панавалі на Беларусі чужынцы, а працоўны народ наш гібеў у зьдзеку, няволі і цемнаце. Бесканечныя войны палівалі нашую старонку рэкамі крыві, а звадкі між народамі і верамі ў самай Беларусі атручывалі дух народны, нішчылі ўсе здабыткі культуры і не давалі тварыцца новым. Аж зразумелі ўрэшце лепшыя сыны Беларусі, што прычына ўсіх няшчасьцяў — гэта палітычны заняпад народу Беларускага, яго няволя і пакора, і прагаласілі яны на ўсю Беларусь, што павінен устаць Беларускі народ, скінуць путы няволі і з парабка гаспадаром зрабіцца на сваёй зямлі.

Разышоўся голас гэты па Беларусі, і абудзіўся Народ. І на вялікі ўсенародны сход, які адбыўся ў сьнежні месяцы 1917 г. у Менску і называецца Усебеларускім Зьездам, прыслаў Народ Беларускі каля дзьвёх тысяч чалавек сваіх лепшых прадстаўнікоў з усіх частак, усіх валасьцей, усіх закуткаў Беларускай Зямлі. Не збаяўшыся цёмных сілаў, што тады панавалі на Беларусі, перад наведзенымі кулямётамі і навіслымі штыхамі сказаў Зьезд волю Народу Беларускага аб яго будучыне. Народ Беларускі выракаецца сваіх няпрошаных апякуноў. Ен устанаўляе на сваей зямлі Дэмакратычную Рэспубліку і хоча прамаўляць на сусьветным міравым кангрэсе вуснамі сваіх уласных прадстаўнікоў. Ен творыць войска для абароны свайго права і даручае ўладу ў Беларусі выбранай на зьездзе Радзе і яе Спаўняючаму Камітэту.

Паны камісары разагналі Усебеларускі Зьезд і шукалі спосабу зьнішчыць Раду зьезду. Ды не ўдалося гэта ім. Пасьля іхнага ўцёку з Менску ўлада перайшла да Спаўняючага Камітэту Рады Зьезду, і той стварыў тады першае Міністэрства Беларускае — Народны Сэкрэтарыят, а так сама пачаў тварыць беларускае Народнае войска.

Пасьля вякоў няволі ізноў запанаваў на сваёй зямлі Беларускі народ. Але нядоўгае было гэтае панаваньне. Цераз тры дні прыйшлі ў Менск войскі нямецкага імпэратара. Яны гвалтам адабралі ад Народнага Сэкрэтарыяту ўладу і спынілі яго работу. Патаемна мусіў пасьля таго зьбірацца Беларускі Урад, хаваючыся ад нямецкіх жандароў, але ні на мінуту не забываўся ён аб вялікіх абавязках, на яго Народам узложанных. 9 сакавіка 1918 г. Спаўняючы Камітэт Рады Зьезду выдаў Устаўную Грамату, якая тлумачыла тыя правы працоўнага народу, што выбраў Усебеларускі Зьезд. А 25 сакавіка ён, злучыўшыся з прадстаўнікамі Земстваў і Гарадоў і ўтварыўшы разам **Раду Беларускай Народнай Рэспублікі**, абвесьціў Беларусь незалежнай і вольнай Дзяржаваю, каб не дазволіць далей чужынцам камандаваць Беларускім Народам, разрываць яго на часткі, ды гандляваць Беларусьсю на сусьветным рынку. Так былі скінуты з Беларускага Народу апошнія путы няволі, якія ціснулі яго праз вякі.

Ішоў час, але не зьменшаўся ўціск нямецкага імпэратарскага Ураду. З усяго краю надыходзілі да Рады Беларускай Народнай Рэспублікі скаргі і пратэсты проці гэтага ўціску, а Рада нічога не магла зрабіць, бо яшчэ не пасьпеў сабраць Беларускі народ сілы свае і моцным мячом падперці сваю Раду. Ня маючы сілы, Рада Рэспублікі надзеялася хоць сваёю пакораю зьмягчыць цяжкое палажэньне Беларусі. Яна некалькі разоў зварочвалася да нямецкага ўраду, просячы, каб той прызнаў Беларускі Народ вольным і незалежным і даў яму магчымасьць самому ўпраўляць сваёю зямлёю. Нямецкі ўрад кожны раз адказваў адмоўна.

Тым часам у Нямеччыне сталася рэвалюцыя і нямецкае войска ня хоча больш аставацца ў нашай зямлі, з якой гэтак несправядліва зрабіў яго даўнейшы імпэратарскі ўрад. Беларусь ізноў астаецца вольнаю і яе ўрад мае абвесьціць выбары да Беларускага Устаноўчага Сэйму, які сваім голасам умацуе правы народу і ўстановіць дзяржаўны лад Беларусі. Але хоць шмат зьмяніла рэвалюцыя, ды не зьмяніла яна нешчасьлівай долі Беларускай. Ня хочуць панаехаўшыя ў наш край чужынцы выпускаць са сваіх рук лейцаў, у якіх трымалі дагэтуль Беларускі народ. У Менску, ў Кіеве разам з нашымі адступнікамі яны твораць фальшывыя ўрады і крычаць аб сваім праве на панаваньне над Беларускім Народам, аб тым, што Беларусь ніяк ня можа быць вольнаю, а павінна канечна ісьці ўзноў у ярмо. Пры гэтым яны не шкадуюць выдумак, каб ачарніць Раду Рэспублікі і словамі сваймі апаганіць яе працу. Уся мэта гэтых людзей пасварыць беларусаў між сабою, а пасьля, абязсіліўшы іх, аддаць у даўнейшую няволю, — пад панаваньне новага цара і яго чыноўнікаў.

Рада Рэспублікі аднак верыць у сьветлы і здаровы розум народу Беларускага і ўсіх дэмакратычных народаў Беларусі, якія не дадуць сябе ашукаць хітрым ворагам Рэспублікі. Яна вядзе далей сваю працу, а для спаўненьня сваіх загадаў яна ўстанавіла новы склад Рады Беларускіх Народных Міністраў, які павінен вывесьці Беларусь на сьветлы лепшы шлях, абараніць праўдзівую яе незалежнасьць і даць працоўнаму малазямельнаму народу зямлю, а работнікам дагаднейшыя варункі працы і склікаць Устаноўчы Сэйм Беларускай Народнай Рэспублікі.

Перад сьвітаньнем новага дня, які суліць нашай Бацькаўшчыне культурны росквіт і дзяржаўную незалежнасьць, павінны абудзіцца ўсе жывыя дэмакратычныя сілы Беларусі. Усе, хто хоча бачыць сваю многапакутную Бацькаўшчыну—Беларусь вольнай, багатай і шчасьлівай, усе, хто хоча, каб працоўны народ Беларусі ня знаў болей зьдзеку над сабою і няволі, няхай усюды злучаюць свае сілы, **ствараючы на мясцох Беларускія Рады** і зьвязуючы іх з Радаю Рэспублікі. Толькі ім, гэтым арганізацыям працоўнага Народу Беларусі, належыць цяпер, да сазыву Устаноўчага Сэйму, ўлада на мясцох, а ня Земству, ня чыноўнікам, ня ўсякім самазванцам і чужынцам. Толькі на іх павінен апірацца Беларускі Народны Урад у сваёй чыннасьці. Сам народ, абуджаны рэвалюцыяй, няхай бароніць сваю волю і незалежнасьць, правы на сваю родную зямлю і мейсца на сьвеце сярод усіх Народаў.

Чувайце грамадзяне Беларускай Народнай Рэспублікі! Надыходзе гадзіна апошняга суду над народамі. Няхай-жа не пагасьне ў сэрцах вашых жывы агонь замілаваньня да волі і агульна-грамадзкага шчасьця.

Няхай жыве незалежная Беларуская Народная Рэспубліка!

Няхай жыве працоўны народ Беларусі і солідарнасьць вольных народаў!

Няхай растуць Беларускія сялянскія і работніцкія Рады па ўсёй Беларусі!

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі.

28.XI.1918.
м. Менск.

най гаспадаркі вялікарускую «бошчыну», каторая яўляецца ўласьніцай усей вясковай зямлі якую дзеляць між гаспадарамі і ад часу да часу робяць між імі «перадзелы» дзеля выраўнаваньня гаспадарак. Вось гэным «обшчынам» соцыял-рэвлюцыянеры і мяніліся аддаць усе казённыя і прыватныя землі дзеля *супольнага уладаньня.* Ды гэткую рэформу проектавалі завясьці і ў нас, хаця ў нашым краю зусім няма «обшчыны» і зямля належыць да сялян на аснове прыватнай уласнасьці.

У свой час многа пісалася аб усіх гэтых праграмах. Для нашага краю праграма соц. рэв. была зусім неадпаведная, бо ніводзін сялянін ня пристаў-бы на соцыялізацыю яго ўласнай зямлі. З гэтага-ж пагляду не магло быць гутаркі і аб муніцыпалізацыі ўсіх прыватных зямель, у тым ліку і прыватнай сялянскай уласнасьці. Што-ж датычацца «прырэзкаў», дык яны, папраўдзе, зусім не маглі быць названы *рэформай*: ад іх, праўда, сяляне крыху падмацаваліся-бы, але без агульнае зьмены нашых эканамічных адносін ход разьвіцьця зямельнае справы нічога не зьмяніўся-бы.

Не разьвязала зямельнага пытаньня і большэвіцкая рэвалюцыя: яна разьбіла вялікую зямельную ўласнасьць, зруйнавала тыя арганізацыі, якія кармілі ўвесь край хлебам, ды ўвесь цяжар кармленьня краю пералажыла на сялян, зусім непрыгатаваных да выробляньня вялізарных абшараў панскіх зямель. У рэзультаце па ўсёй большэвіцкай Расеі пануе голад, і ад сялян гаспадароў хлеб для мест адбіраюць гвалтам.

Вось чаму перш, чым гаварыць аб спосабе разьвязкі зямельнага пытаньня, трэба выпрацаваць асновы разьвязкі. Форму разьвязкі падыктуе само жыцьцё.

(Далей будзе).

У Вільні і ваколіцах.

× **Беларускае войска.** Форміруюцца беларускія палкі. Афіцэраў і салдатаў для запісу на службу просяць зварочавацца ў Беларускі аддзел Ваеннай Літоўскай арганізацыі (Юрскі праспэкт № 11).

× **Прыезд А. О. К. 10.** Глаўная каманда 10 арміі і галоўныя вайсковыя часьці прыехалі з Менску ў Вільню.

× **Выезд банкаў.** Бышыя тут дагэтуль тры нямецкія крэдытныя ўстановы: Darlehenskasse Ost, Ostpreussische Landschaft і Ostbank пакінулі ўжо места.

× **Палягчэньне карэспандэнцыі.** Загадам Gouvernement дапускаецца вясьці карэспандэнцыю паміж ваеннымі і жыхарамі.

× Салдацкая Рада апавяшчае, што продаж і купля розных салдацкіх рэчаў срога забаронена, і злоўленыя ў гэтым праступку людзі будуць адданы пад ваенна-палявы суд.

× Штадтгаўптманн апавяшчае, што ў панядзелак 9 сьнежня ў 9½ нараніцы, Дамініканская 3, на панадворку, ўлева, будзе продаж з аўкцыёна арыштаваных за няплату падаткаў рэчаў, між іншым: 41 скрынка мянтушак, 320 пакетаў штучнае кавы і 26 тузінаў мыла.

З усяго Краю.

Беларускія прадстаўнікі у Тарыбе.

Беларускія прадстаўнікі складаюць 25% усяго складу Тарыбы. Цяпер ад беларусаў уваходзяць: Казімір Фалькевіч, Іван Луцкевіч, Вацлаў Ластоўскі кс. Уладыслаў Толочка, Дамінік Семашко і Я. Станкевіч. З павялічаньнем складу Тарыбы будзе павялічана і лічба беларускіх прадстаўнікоў.

Палажэньне ў Эстляндыі.

Нямецкі генэральны камісар Балтыкі, Вітык, наказаваў: «13 лістапада нямецкая ўлада перадала краёвую ўладу эстонцам, папераджаючы, што нямецкае насяленьне Эстляндыі ёсьць пад абаронай Нямеччыны і што ўсяк варожы акт проціў яго будзе разглядацца, як скіраваны проціў Нямеччыны. Нямецкія войскі адышлі на лінію Вэзэнбэрг-Логусу. Для арганізацыі абароны Эстляндыі эстляндзкаму ўраду перададзена аружжа і 1 міліон 500.000 марак. Эстонскі ўрад лічыць небясьпечнасьць унутранага большэвіцтва ў Эстляндыі невялікай.

З Латвіі.

Нямецкія войскі будуць адведзены за Дзьвіну, дзе яны астануцца неазначаны час.

Заняцьце большэвікамі Пскова

25 лістапада большэвіцкія войскі ў чысьле 15.000 душ з сільнай артылерыяй занялі Пскоў.

Места папала ў рукі большэвікоў з прычыны здрады часьці мясцовага насяленьня — укрытых большэвікоў. Белагвардзейцы мелі вялізарныя страты ад большэвіцкай артылерыі. Ад поўнага зьнішчэньня белай гвардыі выратавалі немцы. Адна нямецкая рота не пасьпела ў свой час адыйсьці і была акружана. Лёс яе невядомы.

У аўторак, 26, большэвікі занялі Ізборск і падыйшлі да Пячоры. Увечары таго-ж дня Пячора была занята. Ждуць заняцьця Вэрро.

Крытычнае палажэньне утварылася з прычыны ўнутраных большэвікоў, якія ззаду за нямецкім войскам аказваюць паддзержку большэвіцкаму войску.

ЛЯНДВАРОВА. У конскім лазарэце разпрадаюць добрых рабочых каней.

РЫГА. У урадовых кругох Латвіі йдуць гутаркі аб магчымасьці фэдэрацыі Латышскай дзяржавы з Літвой. У нямецкіх кругох Рыгі адносяцца да ідэі фэдэрацыі з Літвой так сама прыхільна, але фэдэрацыі не аднэй Латвіі, а ўсяго Балтыцкага краю.

Украіна.

КІЕУ. Саюзьнікі прызналі ўрад Гэтмана.

З Польшчы.

ВАРШАВА. Кіраўнікі пруских палякоў: Корфанты, Зэйда і Энглік, як клерыкалы, адмовіліся быць у складзе ўраду, да якога належаць соцыялісты Пілсудскі і Дашынскі, і вярнуліся ў Познань.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

ЛОНДОН. 30.XI (Рэўтэр). У занятых землях Расеі установлен курс фунта стэрлінгаў 40 руб. замест 9 р. 60 кап. перад вайной.

БЭРЛІН. У гутарцы з членам распушчанага Рэйхстагу Абляцам Гіндэнбург заявіў, што стараньні саюзьнікаў адбудаваць старую Расею ня могуць удацца. Ен пераконан, што як у заходніх акраінных дзяржавах, так і на Украіне нарадзіўшайся ідэі незалежнасьці ўжо нельга будзе задушыць.

З усяго сьвету.

БЭРЛІН. 26.XI З занятых саюзьнікамі часьцей Нямеччыны наказываюць аб прыпадках згвалтаваньня кабет чорнаскурнымі ваякамі.

ЛОНДОН. 30.XI (Рэутэр). Льлейд Джордж у выборчай прамове сказаў, што хоць Нямеччына ня можа заплаціць усіх прэтэнзій саюзьнікаў, аднак, яна будзе прымушана заплаціць максімум таго, што дужа. Доўгія гады будзе працаваць нямецкі народ, каб зыск з яго працы йшоў на аплату шкод саюзьнікаў у сусьветнай вайне.

ЛОНДОН. 2.XII (Рэўтэр). Тут адкрылася конфэрэнцыя саюзьнікаў, у каторай прынімаюць участьце Льлёйд Джордж, Бальфур, Бонар Лёў, сэр Гэнры Вільсон, Фош, Клемансо, Орляндо, Сонніно.

Конфэрэнцыя занялася пытаньнем аб набліжаючыхся мірных перагаворах і аб долі нямецкага імпэратара.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 3.XII. Французы энэргічна ніштожаць сьляды нямецкай мінуўшчыны ў Эльзас-Лётарынгіі. У Страсбурскім унівэрсытэце нямецкая мова выведзена з ужыцьця. Увесь вучыцельскі нямецкі пэрсонал у сярэдніх і ніжэйшых школах адсунен[illegible] урадаў і замяняецца францу[illegible].

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 3.XII. Нямецкі ўрад пратэставаў у саюзьні[illegible] проціў увядзеньня калё[illegible] войск у межы Нямеччыны: гв[illegible] жонак і іх іншыя праступкі [illegible] рываюць аўторытэт бел[illegible] чох і рана ці позна акажацца [illegible] самых саюзьніках, каторыя [illegible] чачы вярункам замірэнь[illegible] часьць Нямеччыны афрыканскім войскам.

ВАШЫНГТОН (Рэўтэр) 2.XII. На конгрэсе прэзыдэнт [illegible] сказаў, што канчальная [illegible] сусьветнай вайны буд[illegible] вясной. У сэнаце л[illegible] публіканскай партыі за[illegible] тэст проці паездкі [illegible] Эўропу.

Амэрыканская дэлег[illegible] ры будзе складацца з [illegible] Вільсона, палкоўніка Га[illegible] ла Гэнры Уайт, генэрал[illegible]

ПРАГА. 3.XII. Нац[illegible] сабраньне прыняла дэкр[illegible] ры касуе дваранства, ор[illegible] тулы.

БЭРН (В.Т.Б.). 2.XII. [illegible] ская соцыялістычная [парт[illegible] тачавіла пачаць перагавор[illegible] народным соцыялістычным [illegible] для склікаńня міжнароднай кон-фэрэнцыі, каб устанавіць справядлівы даўгі мір.

БЭРЛІН. Закон аб скліканьні нямецкага нацыянальнага сойм[illegible] мае на ўвазе 38 выбарных [illegible] гаў з 433 дэпутатамі. Кож[illegible] біральнік мае права выбіра[illegible] кі ў месцы свайго паста[illegible] быцьця.

ВЕНА (В.Т.Б.). 4.XII. [illegible] нальны сэйм нямецкай А[illegible] склікаецца за два тыдні [illegible] выбараў. Ен будзе складацца 255 дэпутатаў, выбраных на аснове агульнага выбарнага права з учасьцем жонак (кабет).

ЛОНДОН. Нэжалежная [illegible] кая работніцкая партыя ап[illegible] вала выбарны маніфэст, у [illegible] дамагаецца, каб выбары ў [illegible] палату адбываліся пад [illegible] міжнароднай дэмакратыі.

Пачтовая скрынка.

Тав. Краскоўскага просім прысьці ў Рэдакцыю „Гомана.

Александра Касатага з Цэзарышак просяць прыбыць як найхутчэй у рэдакцыю „Гомана“.

Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.